СПАЗНАЦЬ КІТАЙСКУЮ МУДРАСЦЬ 4

БЯЗВІЗ У СЭРЦЫ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

22 СНЕЖНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 248 (30128)

КАРОТКА

- **Конкурс дзіцячага малюнка «Нам свет завешчана берагчы» аб'яўлены ў Беларусі.**
- У Калядны вечар 24 снежня ў 22.20 на тэлеканале «Беларусь 1» пачнецца трансляцыя святочнай службы са сталічнага Архікафедральнага касцёла Прасвятой Дзевы Марыі.
- **Мікалай Снапкоў: паводле вынікаў 2023 года інфляцыя складзе каля 5,5 %.**
- Правілы прыёму ў спецыялізаваныя ліцэі МУС абнавілі ў Беларусі.
- **Зборная Беларусі завяршае 2023 год на 95-й пазіцыі рэйтынгу ФІФА.**
- Праект «Васільковы край» у 2024 годзе пачне працаваць па ўсёй Віцебскай вобласці.
- **Прэм'еру «Залатога ключыка» прапануе драмтэатр у Віцебску.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім СІНЯЎСКІ, міністр па надзвычайных сітуацыях:

«Гэты год, як і ранейшыя, выдаўся дастаткова напружаным у рабоце кожнага ратавальнага падраздзялення. Было больш за шэсць тысяч выездаў на ліквідацыю розных надзвычайных сітуацый. Да нашага вялікага гонару, нам удалося выратаваць больш за пяць тысяч чалавечых жыццяў. Але самае галоўнае, што другі год запар нам удаецца вытрымліваць дынаміку скарачэння гібелі людзей ад надзвычайных сітуацый. Гэта дынаміка назіраецца як па лініі надзвычайных сітуацый, звязаных з пажарамі, так і па лініі гібелі людзей на вадзе. Гэта вельмі важны кірунак, які знаходзіцца на пастаянным кантролі».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Рэгуляванне ў цэнаўтварэнні — пытанне справядлівасці»

Працаваць трэба, не парушаючы эканамічных законаў, справядліва і сістэмна

Нарада па самай народнай тэме з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі прайшла ў Палацы Незалежнасці. На парадку дня — цэны, механізм іх рэгулявання і кантроль. Гэтая тэма ўжо разглядалася на ўзроўні кіраўніка дзяржавы ў кастрычніку мінулага года. Тады размова ішла перш за ўсё аб прадуктах і таварах паўсядзённага попыту. Прэзідэнт паставіў жорсткае патрабаванне — каб цэны былі справядлівымі, а асартымент — максімальна шырокім. Крыху пазней агульнымі намаганнямі быў выбудаваны парадак рэгулявання цэн са зразумелымі ўмовамі цэнаўтварэння. Тады такое рашэнне кіраўніка дзяржавы скептычна прынялі як адказныя за гэта службовыя асобы, так і апаненты ўлады, але стратэгія аказалася правільнай.

Фота БелТА.

Адступленне ні ўлева, ні ўправа не будзе

У пачатку гэтай нарады кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, калі ўраду было даручана заняцца гэтай праблемай, гаворка не ішла аб замарожванні ці нават аб стрымліванні цэн. Яна вялася аб рэгуляванні цэнаўтварэння. «Недзе стрымлівалі, недзе цэны падрасталі. Эканоміку не падманеш. І не было ніякага глупства, што мы дзейнічалі нібыта супраць законаў эканомікі», — сказаў ён. Беларускі лідар падкрэсліў, што, калі сёння замарозіць цану там, дзе яе нельга замарожваць, заўтра знікне тавар, ніхто не будзе працаваць. А ніхто ў страту працаваць не будзе, з гэтага і выходзілі. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што на нарадзе прысутнічаюць людзі, якія вырабляюць тавар (міністры), людзі, якія прадаюць тавар, і людзі, якія арганізоўваюць працэс у цэлым. Такі склад удзельнікаў прапанаваў урад, паколькі ўсе адказныя павінны чуць і разумець, аб чым ідзе гаворка: хтосьці будзе прымаць рашэнні, а хтосьці будзе выконваць. Удзельнікі нарады на працягу трох гадзін з розных бакоў разглядалі галоўнае пытанне, закранулі і іншыя аспекты, якія ўплываюць на цэнаўтварэнне ў краіне.

«Я хачу, каб вы разумелі, што адступленне ні ўлева, ні ўправа ад дадзенай праблемы не будзе. Гэта пытанне маральнае, стратэгічнае, палітычнае. Як хочаце называйце. Але галоўнае — гэта пытанне справядлівасці», — адзначыў Прэзідэнт. Ён прывёў прыклад: выраслі цэны, дапусцім, на малако — трэба вызначыць, каму ў кішэню пайшоў прырост гэтых цэн. Калі, дзякуючы яму, павялічыліся зарплаты даярак — адна справа. Аднак у рэальнасці ўсё не так: «Але ж вы па дакладзе Камітэту дзяржкантролю бачылі, што гэтыя цэны раскладвалі па кішэнях тыя, хто сёння менш за ўсіх заслугоўвае. І нават не гандлёвыя работнікі, а нейкія гаспадары атрымліваюць па 35 тысяч долараў, як мінімум, у месяц».

Аднак, па словах беларускага лідара, усё ж такі ўдалося вырашыць праблему. Але паколькі гэта пытанне справядлівасці, а запыт на справядлівасць заўсёды быў у славян і ў беларусаў у тым ліку, адсюсі ад гэтага пытання нельга, рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. «Гэта пытанне нумар адзін у нашага народа. І ніякага тут папулізму, звяртаю ўвагу тых, хто вякаць пачне заўтра, няма. Ніякага папулізму перад электаральнай кампаніяй. Мы да гэтага пытання звярталіся пастаянна. Але паколькі звярталіся і пытанне не вырашалася, мной было прынята валявое рашэнне», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

З 1 студзеня павінна быць дакладная сістэма

Прэзідэнт падкрэсліў, што на чарговай нарадзе, прысвечанай цэнаўтварэнню, трэба паглядзець, як гэты працэс развіваецца. Ён назваў адзіную мэту: «ніякія вытворцы, бізнесмены і іншыя, хто займаецца паслугамі, не павінны бегаць у МАРГ, у міністэрствы і ва ўрад і ўзгадняць цэны. З 1 студзеня павінна быць дакладная, зразумелая сістэма. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў на канкрэтным прыкладзе: «Вось у вас 3 працэнты ў год прырост на нейкіх групах тавараў або ў цэлым. І ўсё. У першым квартале працэнт, у другім, у трэцім... А ў чацвёртым дэфляцыя 0,1 працэнта. І людзі будуць разумець, як ім выбудоўваць цэнаўтварэнне. Павінна быць дакладная зразумелая сістэма».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: некаторыя вытворцы крыўдзяцца, што МАРГ не ўзгадніла цэны. «Дык колькі ў МАРГ трэба будзе трымаць людзей, каб яны ўсё гэта бачылі і ўзгаднялі. Вярніцеся ва ўрадзе да гэтай праблемы і нарэшце ўсім задачы — ад дэпутатаў да прэм'ер-міністра. Калі мяне трэба падключыць — калі ласка. Але пытанне павінна быць вырашана», — даручыў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў: сёлета стала відавочна, што гэта пытанне можна вырашаць, як пацвярджэнне — зніжэнне інфляцыі. У краіне інфляцыя складваецца каля 5-6 працэнтаў. Але была 19 працэнтаў. Таксама беларускі лідар нагадаў, што былі апасенні наконт таго, што людзі сыдуць і не будзе каму гандляваць. «Ёсць у нас каму гандляваць. А калі хтосьці не хоча па-чалавечы жыць у Беларусі — дарога адкрыта і туды, і назад», — звярнуў увагу ён.

Прэзідэнт спытаў у першага віцэ-прэм'ера Мікалая Снапкова, да чаго прыйшлі ў вырашэнні гэтага пытання. Прычым, яшчэ раз падкрэсліў ён, ніхто не павінен з урадам узгадняць цэны. Гэта можа прывесці да карупцыйных праяў. Неабходна дакладная, зразумелая сістэма.

У насельніцтва ёсць давер да ўлады

Аб сітуацыі на спажывецкім рынку далажыў першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў. Па яго словах, за 11 месяцаў гэтага года рознічны тавараабарот вырас на 8,2 працэнта. «Значыць, людзі сталі больш хадзіць у крамы і больш купляць? Вось галоўны вынік», — удакладніў Прэзідэнт. Мікалай Снапкоў пацвердзіў, што гэта так.

СТАР. 2

Прыярытэты

«ЭЛЕКТРЫЧНАЕ» ЖЫЛЛЁ І ТАРФЯНАЯ БЯСПЕКА

Міністр энергетыкі расказаў пра вынікі і планы спажывання электраэнергіі ў краіне

Штодня Беларуская АЭС (у складзе двух энергаблокаў) выпрацоўвае звыш 55 млн кВт·г электраэнергіі і ўжо выпрацавала 21,8 млрд кВт·г, дзякуючы чаму краіна сэканоміла 5,8 млрд м³ прыроднага газу. Прагназуецца, што да канца года краіна спажыве 41 млрд кВт·г электраэнергіі, да 28 % якой будзе забяспечана атамнай станцыяй. А ў бліжэйшае пяцігоддзе плануецца збудаваць каля 2 млн м² электражылля.

МІЛЬЯРДЫ КІЛАВАТ, ТЫСЯЧЫ КІЛАМЕТРАЎ

Попыт на электраэнергію ў краіне з боку рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва павялічваецца. За 11 месяцаў агульны аб'ём яе спажывання падрос на 2,3 млрд кВт·г (на 6,6 % да леташняга аналагічнага перыяду) і склаў 37,1 млрд кВт·г электрычнасці, расказаў **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ**:

— Пры гэтым па асобных кірунках, дзе былі прынятыя стымулюючыя меры, рост электраспажывання вышэйшы, чым па краіне. У рэальным сектары эканомікі спажыванне павялічылася на 8,5 %, на аказанне паслуг па зарадцы электратранспарту — на 23 %, на патрэбы гарачага водазабеспячэння і ацяплення насельніцтва — на 38,4 %.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«Рэгуляванне ў цэнаўтварэнні — пытанне справядлівасці»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Як чакалася, прыбытак за рэалізацыю прадукцыі ў гандлі ўпаў. Але і не магло быць інакш, паколькі мы кантралявалі надбаўкі. З 714 арганізацый, якія былі ўлічаны Белстатам за 10 месяцаў, 137 аказаліся стратнымі, прычым 105 з іх сфармулявалі свае страты за кошт бягучай дзейнасці, — адзначыў Мікалай Снапкоў. — Выснова: у гэтай сітуацыі асноўная маса прадпрыемстваў гандлю дэманструе фінансавую ўстойлівасць».

Прэзідэнт параіў не асабліва перажываць за зніжэнне даходнасці невялікай колькасці прадпрыемстваў гандлю. «Што датычыцца іх прыбытку — ды не хвалюйцеся вы за прыбытак у гандлі. Ну, крыху менш яны заплацілі падаткаў у бюджэт», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы спытаў, ці спраўляемся з бюджэтам. Мікалай Снапкоў адказаў, што больш чым.

«Не трэба казаць «больш чым». Малайцы. Там, дзе добра, там добра. А то схопяцца нашы бедныя збеглыя, плакаць пачнуць, што ў іх грошай няма, а тут грошы ёсць, — іранічна заўважыў Прэзідэнт. — Таму страхі, пра якія мы калісьці казалі, — нічога не здарылася і працуем нармальна».

Другую характарыстыку сітуацыі з цэнамі першы віцэ-прэм'ер назваў нават больш важнай. Гэта актыўнасць насельніцтва. За гэты год яна характарызуецца больш за ўсё спажывецкім кірункам — людзі ў асноўным трацяць грашовыя сродкі на набыццё тавараў. Па словах Мікалая Снапкова, перадумовамі гэтага з'яўляецца эканамічная палітыка дзяржавы, якая дазволіла забяспечыць рост рэальнай заработнай платы больш чым на 10 працэнтаў (скарэкціраваны на інфляцыю). Рост спажывецкага крэдытавання вырас у паўтара раза, рост крэдытавання на нерухомасць вырас на 60 працэнтаў, чысты продаж валюты насельніцтвам склаў 400 мільёнаў долараў. «Як вынік, аднавіліся продажы пасля падзення ў мінулым годзе. І, перш за ўсё, тавараў доўгага карыстання. За 9 месяцаў продажы новых аўтамабіляў выраслі на 11 працэнтаў, тэлевізараў — на 16 працэнтаў, веласіпедаў — на 18 працэнтаў, адзення — на 58 працэнтаў. Тавараабарот па харчовых таварах павялічыўся на 4,9 працэнта, па нехарчовых таварах — на 11 працэнтаў.

Таксама, акрамя высокай спажывецкай актыўнасці, назіраецца рост укладаў насельніцтва ў банках, пераважна рублёвых. З пачатку года яны склалі амаль 2,7 мільярда беларускіх рублёў, рост на 25 працэнтаў.

«Выснова — інфляцыйныя чаканні насельніцтва знаходзяцца на нізкім узроўні. Ёсць давер да ўлады, што мы бачым перш за ўсё па банкаўскай сістэме, і давер да крэдытанй палітыкі. І пры гэтым пакупніцкая здольнасць насельніцтва адна з самых высокіх за апошнія гады», — расказаў Мікалай Снапкоў. У параўнанні з 2016 годам за сярэднюю заработную плату можна набыць на 60 працэнтаў больш свініны, ці 183 кілаграмы, на 60 працэнтаў больш мяса птушкі, ці 319 кілаграмаў, малака ў 1,4 раза больш, ці амаль тону, бульбы больш на 10 працэнтаў, ці амаль дзве тоны, прывёў яшчэ адзін прыклад першы віцэ-прэм'ер.

«І гэта ўсё на прылаўках?» — спытаў Прэзідэнт. На што Мікалай Снапкоў адказаў сцвярджальна.

«Такім чынам, спажывецкі рынак характарызуецца стабільнасцю, асартымент тавараў трымаецца і перадумоў да дэфіцыту нейкіх тавараў няма», — рэзюмаваў Мікалай Снапкоў. Пры гэтым, як зрабіў акцэнт Прэзідэнт, супакойвацца нельга. На што першы віцэ-прэм'ер запэўніў, што гэтыя пытанні пастаянна знаходзяцца на кантролі.

Тры фактары інфляцыі

Мікалай Снапкоў далажыў і аб узроўні інфляцыі: на 1 снежня гадавая інфляцыя склала 5,4 працэнта. Гэта амаль у тры разы ніжэй прыросту індэкса спажывецкіх цэн, які склаўся ў кастрычніку 2022 года, на той момант, калі былі прыняты рашэнні і пастаўлены задачы па забеспячэнні абгрунтаванага ўзроўню цэн. Прырост інфляцыі першы віцэ-прэм'ер растлумачыў трыма фактарамі. Першы — асэнсаванае, свядомае рашэнне, прынятае дзяржаўнымі органамі па галіновым рэгуляванні цэн, якія ў сукупнасці абумовілі 2,1 працэнтнага пункта ў агульным узроўні інфляцыі.

«У 2023 годзе павышаны цэны і тарыфы на падакцызныя тавары, тытунь, алкаголь, жыллёва-камунальныя паслугі, пасажырскі, чыгуначны транспарт, паслугі вышэйшай адукацыі і дашкольнай адукацыі», — сказаў Мікалай Снапкоў.

«Гэта там, дзе нельга было ўтрымліваць цэны, — удакладніў Прэзідэнт. — Там, дзе трэба, — калі ласка, падымалі. Недзе стрымлівалі. Але ў будучым годзе такога дысбалансу ўжо быць не павінна. І разбежкі такой».

Другім фактарам прыросту інфляцыі Мікалай Снапкоў назваў рост кошту на імпартныя тавары, пераважна з трэціх краін на фоне курсавых ваганняў. «Гэта імпартаваная інфляцыя. Усе ведаюць, што мы краіна актыўнага знешнегандлёвага абароту экспарт-імпарт. І, канешне, імпартная інфляцыя на нас уплывае прама», — заўважыў ён. Першы віцэ-прэм'ер прывёў лічбы: цэны на імпартныя лекавыя прэпараты выраслі на 12 працэнтаў, на фрукты — амаль на 13 працэнтаў, пасажырскія чыгуначныя перавозкі міжнародных зносін — на 23 працэнты, турыстычныя паслугі — на 22 працэнты.

Прэзідэнт заўважыў, што з цэнамі на фрукты і лекі трэба яшчэ разабрацца. «Тут мы чаго баімся? Нейкі прыватнік з аптэкі сыдзе? Няхай сыходзіць, у нас дастаткова дзяржаўных аптэк, якія будуць гэтым займацца», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз звярнуў увагу на неабходнасць выключыць неабгрунтаванае пасрэдніцтва ў гэтай сферы, каб сфарміраваць справядлівыя цэны на лекі: «Я табе раскажу, як складваюцца цэны на імпартныя лекі, і ты паглядзіш, колькі там «пракладак», як я гавару: сыноў, блізкіх свайго і палюбоўніц».

Трэці фактар прыросту інфляцыі, па словах Мікалая Снапкова, — прынятае дзяржаўнымі органамі рашэнне ў рамках пастановы № 713 Савета Міністраў ад 19 кастрычніка 2022 года «Аб сістэме рэгулявання цэн». «Прынята 763 рашэнні па павышэнні цэн і 1350 па ўстанаўленні цэн на новыя тавары. Гэта рашэнні, якія прымаліся аблвыканкамамі і дзяржаўнымі органамі дзяржкіравання. Гэтыя рашэнні разам далі інфляцыю каля 1 працэнта ў год», — растлумачыў ён. Пры гэтым найбольш выраслі ў кошце малако, мяса, адзенне. Затое цэны на крупы, макароны, сінтэтычныя мыйныя сродкі знізіліся (каля 5 %).

«У рамках усёй выбаркі Белстата па 70 пазіцыях тавараў цэны растуць стрымана, у межах чатырох працэнтаў. У сукупнасці прырост цэн на цэны, якія рэгулююцца, у рамках 713-й пастановы склаў 2,7 працэнта», — сказаў ён. Першы віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што цэны ў Беларусі на большасць тавараў традыцыйна меншыя, чым у Расіі.

«Але ў гэтым ёсць пэўная небяспека. Людзі павінны разумець, што, калі мы яшчэ ніжэй будзем трымаць цэны, а ў Расіі вырастуць, тавар сыдзе, мы гэта праходзілі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Мікалай Снапкоў пацвердзіў, што гэта можа быць небяспечна, таму і выконваецца баланс.

«За 19 дзён снежня цэны выраслі на 0,5 працэнта, у асноўным гэта сезонны рост цэн на агародніну ці імпартныя фрукты. У цэлым па годзе інфляцыя складзе 5,4-5,6 працэнта», — далажыў Мікалай Снапкоў.

Трэба варушыцца!

Асобна Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на рост цэн на айчынную агародніну, у прыватнасці на агуркі і памідоры. Яшчэ вясной кіраўнік дзяржавы даручаў вырашыць праблему з вырошчваннем плодаагароднінай прадукцыі ў міжсезонне. Тады Прэзідэнт прапаноўваў пабудаваць больш цяпліц, каб на працягу ўсяго года можна было забяспечваць беларусаў сваёй агароднінай. Аднак ва ўрадзе вырашылі паспрабаваць вырашыць гэтую праблему з найменшымі ўкладаннямі. Віцэ-прэм'ер Леанід Заяц запэўніў, што аддача атрымалася добрай: на прылаўках айчыннай прадукцыі хапае, а ў параўнанні са снежнем 2022 года цэны на агуркі знізіліся прыкладна на 16,5 працэнта.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на сезонны рост цэн на агародніну. Ён заўважыў, што людзей хвалююць сённяшнія, а не леташнія цэны ў крамах. «Вырабіце гэтых агуркоў у дастатковай колькасці. Людзі хочуць, каб і ў Новы год яны былі таннейшыя, — запатрабаваў ён. — Я вам гаварыў: «Пабудуйце яшчэ 10 цяпліц». — «Мы падсвецім!» «Дык падсвечвайце!»

Як далажыла старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна Мядзведзева, у снежні цэны на тыя ж агуркі ў параўнанні з лістападам выраслі амаль на 66 працэнтаў. Падобная сітуацыя па капусце, цыбулі, бураках, моркве і памідорах.

«Мы падсвецім — агуркі будуць расці самі!» — зыранізаваў Аляксандр Лукашэнка, вяртаючыся да абяцанняў урада. — Вы падумайце, што зрабіць. Я чамусьці стаўлю пытанне. 10—15 гадоў таму я так бы не казаў: дорага было — і газ, і нафта. Але цяпер жа ўсяго хапае».

Віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў запэўніў, што гэтае пытанне знаходзіцца на кантролі членаў урада.

«Варушыцца трэба. Хоць бы там, дзе мы можам, — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. — Майце на ўвазе, гэта наш пачатак па цэнаўтварэнні, нашы першыя крокі. Усё будзе ўпірацца ў вытворчасць, у аб'ёмы. Трэба павялічваць вытворчасць, асабліва там, дзе мы можам».

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ **У тэму**

Унутраны рынак — гэта святое

Размаўляючы з журналістамі па выніках нарады, Мікалай Снапкоў нагадаў, што ў пытанні цэнаўтварэння Прэзідэнт першапачаткова патрабаваў, каб была створана і працавала адпаведная сістэма: «Спачатку гэта было насамрэч нават метадалагічна складана. Але першапачаткова патрабаванне было да нас аб тым, каб працавала сістэма. Эканамічныя законы ёсць і будуць, і іх ігнараваць нельга», — адзначыў ён. Таму, па словах першага віцэ-прэм'ера, будзе выбудавана сістэма, мінімальна звязаная з узгадненнем цэн з кімсьці. Будзе вызначаны працэнтны парог, у рамках якога любое прадпрыемства можа ўстанаўліваць цэны на ўнутраны спажывецкі рынак.

«Гэта не датычыцца прамежкавых, інвестыцыйных тавараў. І гэта дакладна не датычыцца экспарту. На экспарт можае адпраўляць з якой заўгодна цаной і там кампенсаваць недаатрыманы прыбытак на ўнутраным рынку. Мы, у прынцыпе, гатовы да такой сістэмы, і яна будзе з 1 студзеня рэалізавана, як было даручана Прэзідэнтам», — заявіў ён. Мікалай Снапкоў звярнуў увагу, што ў дадзеным выпадку не зусім карэктна гаварыць аб недаатрыманым прыбытку на ўнутраным рынку: «Унутраны рынак — гэта святое. Ёсць розныя даходы ў грамадзян Беларусі і грамадзян тых краін, куды на экспарт адпраўляюць нашу прадукцыю. Ёсць розная сацыяльная нагрузка. Таму на ўнутраны рынак трэба пастаўляць па тых справядлівых цэнах, якія фарміруюцца ў нас у адпаведнасці з 713-й пастановай, якая дзейнічае, і з той новай адкарэкціраванай сістэмай 713-й, якая будзе дзейнічаць у 2024 годзе. Гэта проста святы абавязак — забяспечыць насычэнне ўнутранага рынку», — канстатаваў першы віцэ-прэм'ер.

Журналісты пацікавіліся, ці будуць па-ранейшаму дзейнічаць абмежаванні па гандлёвых надбаўках для гандлёвых сетак. Мікалай Снапкоў адзначыў, што іншых варыянтаў, як працягваць прытрымлівацца гэтай практыкі, няма. «Вопыт і практыка 2023 года паказваюць, што мы знайшлі гэты баланс паміж справядлівым фарміраваннем цаны ў сетках і нястратнасцю сетак», — сказаў ён.

Першы віцэ-прэм'ер у цэлым канстатаваў, што ёсць пэўныя моманты, дзе можна было зрабіць лепш, і ва ўрадзе гэта бачаць. «Асноўная задача — работа над памылкамі. Своечасова выпраўляць памылкі і не баяцца іх. Гэта і ёсць эканоміка, гэта і ёсць жыццё», — сказаў Мікалай Снапкоў. У цэлым эканамічныя вынікі адыходзячага года ён назваў добрымі: «Яны прадыктаваны тым, што мы павышалі ў гэтым годзе заработную плату дастаткова актыўна, пенсіі, стымулявалі спажывецкае крэдытаванне і крэдытаванне на нерухомую маёмасць».

Першы віцэ-прэм'ер таксама звярнуў увагу на рацыянальнасць паводзін грамадзян Беларусі на рынку ў бягучым годзе. Па яго словах, гэта звязана як са спажываннем, так і са зберажэннем. «Гэта, відавочна, падкрэслівае давер беларусаў да эканамічнай палітыкі і давер да ўлад. І мы спадзяёмся, што не падвядзём іх і ў далейшым», — сказаў ён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Новы эмір Кувейта прыняў прысягу перад парламентам

Эмір Кувейта шэйх Мішааль аль-Ахмед аль-Джабер ас-Сабах прыведзены да прысягі перад парламентам краіны. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на трансляцыю працэдуры. Новы эмір Кувейта стаў пераемнікам свайго старэйшага брата шэйха Навафа аль-Ахмеда аль-Джабера ас-Сабаха, які памёр 16 снежня ва ўзросце 86 гадоў. Згодна з Канстытуцыяй Кувейта, пасля смерці эміра трон аўтаматычна пераходзіць да наследнага прынца, які можа прыняць уладу толькі пасля прынясення прысягі ў парламенце. Нябожчык эмір Кувейта ўступіў на трон 30 верасня 2020 года пасля смерці свайго зводнага брата Сабаха аль-Ахмеда аль-Джабера ас-Сабаха, які ўзначальваў краіну з 2006 да 2020 года.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў шэйха Мішааля аль-Ахмеда аль-Джабера ас-Сабаха з назначэннем на пасаду Эміра Дзяржавы Кувейт, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Перакананы, што існуючыя традыцыйна цёплыя адносіны і канструктыўны дыялог паміж Мінскам і Эль-Кувейтам будуць падмацаваны цікавымі інавацыйнымі праектамі ў сферах гандлю, інвестыцый, інфармацыйных тэхналогій, міжнародных фінансаў, — адзначаецца ў віншаванні. Мы гатовы ў найбліжэйшы час прыняць вашу дэлегацыю спецыялістаў па абазначаных і іншых напрамках у мэтах актуалізацыі плана сумесных дзеянняў на перспектыву».

Сабор Парыжскай Божай Маці ўпрыгожыў новы флюгер

Новае ўпрыгожванне шпіля Нотр-Дама стылізавана ў выглядзе фенікса, які ўвасабляе адраджэнне сабора пасля разбуральнага пажару 2019 года, паведаміў Euronews. Шпіль атрымаў новага пеўніка. Як вядома, гальскі певень лічыцца адным з нацыянальных сімвалаў Францыі. Залатая фігурка была спраектавана архітэктарам Філіпам Вільнёвам і ўстаноўлена на вышыні 96 метраў. Ранейшы флюгер, які быў устаноўлены на шпіль у пазамінулым стагоддзі, быў знойдзены пасля пажару сярод абломкаў. Аднак фігурку палічылі занадта пашкоджанай, каб яе можна было належным чынам аднавіць. Так што цяпер яе можна ўбачыць у Нацыянальным музеі французскіх помнікаў у Парыжы.

Пераемнасць пакаленняў

Наталля КАЧАНАВА:

«ЯКАЯ КРАІНА СЁННЯ — ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС, ЯКОЙ ЁЙ БЫЦЬ ЗАЎТРА — ВЫРАШАЦЬ ВАМ»

Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з суворaўцамі

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з выхаванцамі Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча. Спікер верхняй палаты расказала пра законатворчую дзейнасць, ролю СМІ і інтэрнэта, Маладзёжны парламент і праект «Цягнік памяці». Суворaўцаў цікавілі самыя розныя пытанні — ад колькасці моладзі ў парламенце ў будучым да хобі, распарадку дня і мары Старшыні Савета Рэспублікі.

Фота БелТА.

Расказваючы пра дзейнасць Савета Рэспублікі, Наталля Качанава спынілася на рабоце экспертнага савета, на пасяджэннях якога сумесна са спецыялістамі разглядаюцца законапраекты. За два апошнія гады такім чынам разгледжана каля 300 дакументаў.

— Мы бачым, якая сітуацыя складваецца ў свеце. І разумеем, што войны, гарачыя кропкі, тое, што гінуць людзі, што нацызм і фашызм узнімаюць галаву, — гэта страшна. І ў нас былі гарачыя галовы, што свастыкі выколваюць у якасці татуіровак, распаўсюджваюць у інтэрнэце адпаведныя ідэі. Гэта не наша, а навязанае нам. Мы павінны памятаць свае традыцыі і ўшаноўваць памяць тых людзей, якія аддалі жыццё за свабоду і незалежнасць нашай краіны. Таму прымаліся законы аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму, аб генацыдзе беларускага народа, — паведаміла Старшыня Савета Рэспублікі.

Закранула Наталля Качанава і міжнародную дзейнасць верхняй палаты парламента, расказаўшы пра супрацоўніцтва ў рамках СНД, Саюзнай дзяржавы.

— Мы выязджаем і ў краіны дальняй дугі. Зусім нядаўна нашы прадстаўнікі выступалі ў ААН, дзе казалі пра неправамерныя дзеянні ў адносінах да нашай краіны. Тое, што адбываецца сёння ў свеце, не можа нас не насцярожваць, мы абураны гэтым. І як члены Савета Рэспублікі накіроўваем у міжнародныя арганізацыі заявы, каб нас чулі. Заўсёды запрашаем: прыедзьце ў нашу краіну, паглядзіце, як жывуць людзі. І тыя, хто прыязджае, у захапленні ад нашай краіны. А за мяжой ідзе зусім іншая прапаганда, — дадала Наталля Качанава.

Расказваючы пра маладзёжную палітыку ў нашай краіне, спікер Савета Рэспублікі нагадала, што сенатары былі ініцыятарамі ўнясення ў новую Канстытуцыю асобнага артыкула, які датычыцца моладзі.

— Якая наша краіна сёння — залежыць ад нас, якой яна будзе заўтра — вырашаць вам. Мы робім усё, каб перадаць вам мірную, прыгожую, дагледжаную краіну з добрымі магчымасцямі для кожнага. А вы павінны зрабіць усё, каб яе захаваць, бо гэта вялікае шчасце — жыць у суверэннай незалежнай краіне, на сваёй зямлі.

Наталля Качанава расказала суворaўцам пра слаўныя традыцыі кадэцкага вучылішча ў яе родным горадзе Полацку, калектыў якога зусім нядаўна ўдастоены прэміі «За духоўнае адраджэнне».

— Я ганаруся, што ў маім родным горадзе ёсць такое вучылішча. Мы рады, што такая ўвага ўдзяляецца сёння падрастаючаму пакаленню ў ваенных вучылішчах, патрыятычных клубах і з боку Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства абароны, МНС.

Адказна займацца сваёй справай — задача кожнага ў нашай краіне, падкрэсліла Наталля Качанава.

— Наша задача — зрабіць усё, каб захаваць мір і спакой у нашай краіне, каб дзейныя законы былі правільнымі, актуальнымі, каб людзі адчувалі справядлівыя адносіны да сябе. Ганарыцца нам ёсць чым, бо краіна наша выдатная. Паездзіўшы па розных рэгіёнах, я пераканалася ў гэтым. А ўся справа ў кожным з нас. Добра працуе доктар — ты да яго прыйдзеш і парадуешся. Добра выкладае настаўнік — задаволены і дзеці, і бацькі. Таму кожны павінен займацца сваёй справай сумленна і адказна. І мы павінны быць адзінымі ў імкненні захаваць сваю краіну, зрабіць яе лепш і прыгажэй, каб тым, хто прыйдзе пасля нас, было камфортна на сваёй роднай зямлі.

Далей удзельнікі сустрэчы задалі свае пытанні, Наталля Качанава шчыра адказала на ўсе. У прыватнасці, адзін з суворaўцаў пацікавіўся хобі Старшыні Савета Рэспублікі. Наталля Качанава расказала, што вольнага часу ў яе графіку няшмат. Аднак у вольную палову суботы яна абавязкова наведвае басейн — любоў да спорту і актыўнага ладу жыцця засталася з маладосці. А ў нядзелю абавязкова сустракаецца з дзецьмі і ўнукамі і любіць пачытаць.

— Атрымліваецца, што хобі — мая работа. Я прыходжу рана і позна сыходжу. Але мне так камфортна, і я так шмат гадоў працую.

Выхаванцы суворaўскага вучылішча пацікавіліся, якую кнігу павінен прачытаць кожны падлетак. Спікер Савета Рэспублікі параіла чытаць класічныя творы, адзначыўшы, што ў кожным узросце адзін і той жа твор успрымаецца па-рознаму.

— Нядаўна перачытала «Яўгена Анегіна» — там рэчы, якія і сёння для нас актуальныя, у прыватнасці тое, як дакладна паказана чалавечая натура. Класіку трэба чытаць, гэта ваша адукаванасць. Калі сёння за мяжой знішчаюць помнікі Пушкіну, Лермантаву, гэта паказвае найперш іх недальнабачнасць. Я вось цяпер чытаю кнігу «Леў Талстой: уцёкі з раю». Вялікіх пісьменнікаў і паэтаў неабходна ведаць. На вашым месцы я пачытала б і «Маладую гвардыю», — параіла Наталля Качанава.

Напрыканцы сустрэчы суворaўцы пацікавіліся, аб чым марыць спікер Савета Рэспублікі.

— Мір у нашай краіне. Калі ёсць мір, тады можна думаць пра будучыню, будаваць планы. Таму, хлопцы, захоўвайце мір у нашай краіне, — адказала Наталля Качанава.

Алена КРАВЕЦ.

«ЭЛЕКТРЫЧНАЕ» ЖЫЛЛЁ І ТАРФЯНАЯ БЯСПЕКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

16 снежня на першым энергаблоку завершаны другі планава-папераджальны рамонт, падчас якога частка адпрацаванага ядзернага паліва (заменена 42 са 163 цеплавыдзяляльных зборак з палівам) была заменена і змешчана ў басейн вытрымкі. Свежае паліва загрузілі ў рэактар, паведаміў міністр:

— Праведзена рэвізія абсталявання рэактарнай установкі, турбагенератара, галоўных цыркуляцыйных помпаў і іншага абсталявання і тэхналагічных сістэм. Зроблены кантроль металу і дыягностыка зварных злучэнняў абсталявання.

Сёлета ў краіне ўжо пабудавана і мадэрнізавана звыш 2,1 тысячы кіламетраў ліній электраперадачы, а па выніках года лічба будзе яшчэ большай. Мадэрнізавана і ўзведзена больш за 20 падстанцый, найбольш значныя з якіх «Паўночна-Заходняя», «Атлант», «Жабінка», «Камвольны камбінат», «Дубрава», «Аэрадромная», «Чаркасы».

— Большасць з гэтых праектаў рэалізаваны з прымяненнем найноўшых тэхналогій па лічбавізацыі, ва ўсіх падстанцыях выкарыстаны сістэмы аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў, што істотна павышае надзейнасць энергазабеспячэння спажыўцоў, — адзначыў кіраўнік энергетычнага ведамства.

НА АЦЯПЛЕННЕ І ГАРАЧУЮ ВАДУ

Электраэнергія, якую выпрацоўвае БелАЭС, таксама шырока выкарыстоўваецца для электрыфікацыі жылля. Гэтыя работы вядуцца ў некалькіх кірунках. Будаўніцтва новых шматкватэрных і індывідуальных электрадамоў, дзе адразу закладзена выкарыстанне электрычнасці для ацяплення і падагрэву вады. З 2021-га да цяперашняга часу было пабудавана звыш 1 млн м² электражылля.



Перавод шматкватэрнага жылфонду з пячнога ацяплення на электраэнергію. У графікі гэтых работ на пяцігоддзе ўключана каля сотні такіх дамоў у розных рэгіёнах краіны. Ужо мадэрнізаваны знешнія сеткі для пераводу 19 дамоў на выкарыстанне электрычнасці для ацяплення і падагрэву вады.

Перавод індывідуальнага жылля на электрычнае ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне. За гэты год у энергазабяспечвальныя арганізацыі паступіла 22,9 тысячы зваротаў грамадзян на атрыманне тэхнічных умоў, з якіх 94,6 % (21,7 тысячы зваротаў) было задаволена.

— У 5,4 %, якія засталіся незадаволенымі, трапілі грамадзяне, якія пражываюць у населеных пунктах, дзе ўжо праведзена мадэрнізацыя электрасетак, але людзі паўторна не звярнуліся за атрыманнем тэхнічных умоў, хоць энергазабяспечвальныя арганізацыі ім пра гэта паведамілі; грамадзяне, якія жывуць у мястэчках, што газіфікаваны (дзе ёсць вулічныя газаправоды) і дзе дзяржавай ужо створаны ўмовы для больш камфортнага спажывання прыроднага газу для ацяплення.

Адпаведна, з перспектыўнымі планамі і інвестыцыйнымі праграмамі, якія распрацоўваюцца кожны год, прадугледжваецца мадэрнізацыя і рэканструкцыя сетак у тых населеных пунктах, дзе зваротаў грамадзян не змаглі задаволіць. На 2021–2025 гады сфарміраваны (па ўзгодненні з аблвыканкамамі) перспектыўныя планы мадэрнізацыі электрасетак, якія ахопліваюць больш за 5,7 тысячы кіламетраў электрасетак і звыш 1500 населеных пунктаў, дзе будзе магчыма наладзіць выкарыстанне электрычнасці для падагрэву вады і ацяплення, удакладніў Віктар Каранкевіч:

— Мы падрыхтавалі адпаведныя прапановы адносна магчымасці выкарыстання электраэнергіі для падагрэву вады і ацяплення ў населеных пунктах, якія газіфікаваны. Ёсць пэўныя сітуацыі, дзе, магчыма, трэба выпрацоўваць у тым ліку і нестандартныя прапановы і падыходы. Яны сфарміраваны і ўнесены ў Савет Міністраў у выглядзе адпаведнага праекта пастанаўлення. У найбліжэйшы час па дакументе, спадзяюся, будзе прынятае адпаведнае рашэнне. І там будуць адказы на абазначанае пытанне.

ГАЗ ДЛЯ НАС, ТОРФ — НА ЭКСПАРТ

Разам з электрыфікацыяй жылля праводзіцца і яго газіфікацыя. Па ўзроўні газазабеспячэння Беларусь у лідарах сярод краін СНД. Сёння газіфікаваны ўсе абласныя і раённыя цэнтры, гарады і пасёлкі гарадскога тыпу, а таксама больш як 3,6 тысячы сельскіх населеных пунктаў, падзяліўся лічбамі міністр:

— У эксплуатацыю сёлета ўведзена 818 кіламетраў газаправодаў розных катэгорый, газіфікавана звыш 13,2 тысячы кватэр і домаўладанняў. За апошнія 20 гадоў агульная працягласць газавых сетак у краіне вырасла больш як у тры разы і цяпер складае амаль 68 тысяч кіламетраў.

На пяцігоддзе запланавана рэканструкцыя электрасетак у 1,5 тысячы населеных пунктаў, а праекты па газіфікацыі будуць разгорнутыя ў 2030-х. Такім чынам будзе ахоплена найбольшая колькасць мястэчак для стварэння ў іх больш камфортных умоў жыцця.

Важнае месца ва ўмацаванні энергабяспекі краіны займае тарфяная галіна, прадукцыя якой пастаўляецца прадпрыемствам ЖКГ, цэментным арганізацыям, насельніцтву; яна запатрабавана і ў сельскай гаспадарцы, нагадаў міністр:

— Штогод у краіне здабываецца каля 2 млн тон торфу, з якога вырабляецца каля 1,2 млн тон торфапрадукцыі (каля мільёна тон мае паліўнае прызначэнне). Гэта дазваляе штогод замяшчаць больш як 450 млн м³ газу.

Унутраныя патрэбы Беларусі ў тарфяным энергарэсурсе забяспечваюцца цалкам, застаецца і на экспарт (сёлета ў 21 краіну блізкага і далёкага замежжа пастаўлена 141 тысяча тон торфапрадукцыі, з іх 1,9 тысячы тон — у Кітай). У снежні падпісаны меморандум, якім прадугледжаны вопытныя пастаўкі тарфяных субстратаў у В'етнам, абмяркоўваюцца пытанні пашырэння супрацоўніцтва з расійскімі кампаніямі.

Сёлета торфазаводы вырабілі 888 тысяч тон сушонкі і торфабрыкетаў, з якіх 528 тысяч тон накіравана на патрэбы прадпрыемстваў, а 258 тон забяспечыла попыт насельніцтва.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Гуманітарны складнік

СПАЗНАЦЬ КІТАЙСКУЮ МУДРАСЦЬ

Цяпер аб дзяржаўным кіраванні ў Кітаі можна пачытаць па-беларуску

У Акадэміі навук прэзентавалі першы том кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» на беларускай мове. Выданне ўбачыла свет у выніку супрацоўніцтва беларускага выдавецтва «Мастацкая літаратура» і кітайскага Выдавецтва літаратуры на замежных мовах. Гэтая кніга з моманту свайго выхаду і распаўсюджання атрымала шырокі грамадскі рэзананс і высокую ацэнку міжнароднай супольнасці. Публікацыя яе на беларускай мове дае магчымасць нашаму грамадству лепш зразумець Кітай, а таксама спрыяе працягу плённага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

Напярэдадні прэзентацыі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮН** зазначыў, што гэта праца мае вялікае значэнне як для Кітая, так і для ўсяго свету:

— Выданне першага тома кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» на беларускай мове з'яўляецца, безумоўна, важнай падзеяй супрацоўніцтва нашых выдавецкіх і медыяколаў. І ў той жа час — гэта яркае сведчанне высокага ўзроўню цеснага кітайска-беларускага гуманітарнага абмену. Я ўпэўнены, што гэта кніга абавязкова дазволіць беларускім чытачам яшчэ лепш пазнаць і асэнсаваць гістарычную глыбіню культуры і аснову шляху развіцця Кітая. І таксама дапаможа зразумець канцэпцыю кіравання Камуністычнай партыі Кітая, каму яна служыць і на каго абапіраецца, дазволіць спазнаць кітайскую мудрасць для пабудовы яшчэ больш цудоўнага свету. Я перакананы, што прэзентацыя кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» і сімпозіум па дзяржаўным кіраванні яшчэ раз дэманструюць высокі ўзровень і асаблівасці кітайска-беларускіх адносін. Гэта абавязкова будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню ўзаемадаверу, узаемаразумення, узаемадукацыі і традыцыйнага сяброўства паміж нашымі народамі. А таксама выведзе на больш высокі ўзровень абмен вопытам у пытанні дзяржаўнага кіравання паміж нашымі краінамі.

— Гэта важны зборнік ідэй і падыходаў кіраўніка Кітая, сябра нашага Прэзідэнта, з'яўляецца настольнай кнігай для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і практыкай дзяржаўнага будаўніцтва КНР. У ёй абагульнены ўнікальны жыццёвы і прафесійны вопыт, напрацоўкі вялікай каманды аднадумцаў, якія знаходзяцца побач з Сі Цзіньпінам, — адзначыў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.**

Кніга складаецца з чатырох тамоў, якія гарманічна аб'яднаны паміж сабой і фарміруюць адзінае цэлае. У многіх з васямнаццаці глаў першага тома разглядаюцца пытанні дзяржаўнага кіравання, устойлівага развіцця эканомікі з акцэнтам на інавацыі і рэвалюцыі ў энергетычным сектары. А, напрыклад, культура разглядаецца як «мяккая сіла» і адзін з найважнейшых фактараў дзяржаўнага кіравання. Можна тут даведацца і пра тое, што Камуністычная партыя Кітая прытрымліваецца падыходу, арыентаванага на народ, напоўненага шчырым пачуццём дзяліць з ім адзін лёс і жыць агульнымі думкамі.

— Традыцыі беларуска-кітайскіх узаемаадносін абумоўлена агульнасцю прынцыпаў унутранай і знешняй палітыкі, супадзеннем поглядаў на праблемы ў сусветным парадку дня. Кіраўнікі нашых дзяржаў з'яўляюцца добрымі сябрамі, рэгулярна праводзяць сустрэчы, што дае дадатковы імпульс развіццю самых розных сфер узаемадзеяння, — сказаў **першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Нават знаходзячыся далёка адно ад аднаго, Кітай і Беларусь актыўна развіваюць культурныя, эканамічныя і палітычныя сувязі з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін, якія ўмацоўваюцца кожны год. Выданне кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» — яшчэ адзін праект, накіраваны на далейшае ўмацаванне сяброўства, узаемнага даверу і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў гуманітарнай сферы.

Першы том кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» дазволіць шырокаму колу чытачоў не толькі лепш зразумець, што ўяўляе сабой сённяшні сацыялізм з кітайскай спецыфікай, але і больш даведацца пра кітайскі народ і яго жыццё. У выдавецтве «Мастацкая літаратура» сёння працягваецца праца і над наступнымі тамамі выдання. Так, ужо пераслалі кітайскім калегам пераклад другой кнігі, заключана пагадненне аб выданні другога і трэцяга тамоў. Вялікая верагоднасць, што потым прыйдзе чарга і працы над чацвёртым томам.

— Улічваючы і вялікі аб'ём першага тома кнігі, і саму яе спецыфіку, пераклад не мог і не павінен быў быць вельмі хуткім. Наколькі я памятаю, у нашага перакладчыка Дзмітрыя Пятровіча асноўная праца заняла 8-9 месяцаў. Пасля пераклад быў адасланы кітайскаму боку на рэцэнзію для ўнясення магчымых правак. Нягледзячы на спецыфіку кнігі, мова яе дастаткова простая, што робіць яе даступнай і для самых розных слаёў насельніцтва, і для перакладчыкаў з розных краін. А кніга, заўважу, перакладзена ўжо больш чым на 30 моў свету, — тлумачыць **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК**. — У працэсе падрыхтоўкі першага тома пытанні ў асноўным датычыліся выкарыстання таго ці іншага слова ў канкрэтным кантэксце. Нам, дарэчы, не агучылі імёны рэцэнзентаў, але, безумоўна, гэта прафесіяналы ў сваёй справе. І пераклад Дзмітрыя Пятровіча яны ацанілі як вельмі добры. Увогуле, скажу, што гэта не першы наш сумесны беларуска-кітайскі праект і нашы кітайскія партнёры заўсёды вельмі адказна ставяцца да выдання сваіх кніг за мяжой.

Алена ДРАПКО.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Нашы дзеці

ПАД ГУКІ КРЫШТАЛЬНАГА ВАЛЬСА

Больш за 90 таленавітых студэнтаў устаноў адукацыі Віцебшчыны сабраў традыцыйны абласны баль, які прайшоў напярэдадні Новага года на пляцоўцы «Паўночнай сталіцы».

Абласны навагодні баль для навучэнскай і студэнцкай моладзі праводзіцца штогод у рамках дабрачынай акцыі «Нашы дзеці», якая праходзіць пад патранатам Прэзідэнта. Сёлета «разынкай» святочнага мерапрыемства стала яго крыштальная тэматыка, якая чырвонай ніткай праходзіла праз афармленне залы, шматлікіх фотазон, пышных сукенак. А крыштальныя бутаньеркі для юнакоў і дзяўчат стварылі ў Віцебскім дзяржаўным індустрыяльна-тэхналагічным каледжы.

Гэтым цёплым снежаньскім вечарам на баль прыбылі найлепшыя студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі вобласці, навучэнцы Віцебскага і Полацкага кадэцкіх вучылішчаў, Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў, Віцебскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага, сярод якіх выдатнікі вучобы, пераможцы розных конкурсаў і алімпіяд, актывісты, валанцёры, спартсмены. Многія з іх занесены на Дошку гонару сваёй установы, адзначаны граматамі і падзякамі, з'яўляюцца ўладальнікамі персанальных стыпендый.

Павіншаваць удзельнікаў балю з надыходзячымі святамі прыехалі пачэсныя госці, у ліку якіх кіраўніцтва паўночнага рэгіёна, навучальных устаноў і арганізацый вобласці. «Па добрай традыцыі гэта свята аб'яднала найлепшых студэнтаў, кадэтаў, навучэнцаў, якія дасягнулі пэўных поспехаў у вучобе, навуковым і грамадскім жыцці, творчасці, спорце. У Год міру і стваральнай працы вашы поспехі і адкрыцці — яркі прыклад патрыятызму, адданасці роднай краіне і абранай справе. Дзяржава дае вялікія магчымасці для рэалізацыі патэнцыялу моладзі: бясплатную адукацыю, магчымасць карыстацца найноўшымі распрацоўкамі і тэхналогіямі, рэалізоўваць перспектыўныя ініцыятывы і многае іншае. У кожным з вас закладзены найлепшыя нацыянальныя рысы: працавітасць, адказнасць, павага да нашай краіны, яе гісторыі і традыцый. З упэўненасцю можна сказаць, што з вас атрымаюцца высакакласныя спецыялісты, якія праслявяць родную Віцебшчыну і Беларусь», — зачытаў віншавальны адрас старшыні аблвыканкама Аляксандра Субоціна яго намеснік Вячаслаў Дурноў і дадаў, што на балі сабралася самая таленавітая, актыўная, крэатыўная і мэтанакіраваная моладзь. Той шлях, па якім яны ідуць, не заўсёды лёгкі, але цікавы і запамінальны.

Найлепшыя студэнты і навучэнцы ўстаноў адукацыі вобласці былі адзначаны ўзнагародамі аблвыканкама.

Як і належыць сапраўднаму балю, юнакі і дзяўчаты ў суправаджэнні Сімфанічнага аркестра Віцебскай абласной філармоніі акунуліся ў свет паланэза, вальса, кадрылі, полькі. Плаўным і ўпэўненым рухам пар на паркеце папярэднічалі шматлікія рэпетыцыі. Так, чацвёртакурснікі Полацкага кадэцкага вучылішча Глеб Семянік і Дар'я Гурчонак былі запрошаны на абласны баль упершыню. «Было складана сумяшчаць рэпетыцыі ў Віцебску з вучобай, аднак гэта каштавала таго, каб апынуцца тут. Атмасфера цудоўная, яна стварае асаблівае адчуванне Новага года», — падзялілася пара.

Дарэчы, кадэты на балі асабліва вылучаліся выпраўкай. Сёлета Полацкае кадэцкае вучылішча за плённую дзейнасць у грамадзянска-патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення ўзнагароджана прэміяй «За духоўнае адраджэнне», а Віцебскае кадэцкае вучылішча па выніках навучальнага года 2022/2023 стала найлепшай установай у сістэме кадэцкай адукацыі нашай краіны.

Быў запрыкмечаны сярод галантных кавалераў студэнт трэцяга курса Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Уладзіслаў Вугалеў. Для яго адыходзячы год запомніўся грандыёзным праектам «Студэнт года».

У завяршэнні свята ўдзельнікі атрымалі навагоднія падарункі ад Дзеда Мароза і Снягуркі. Скончыўся крыштальны баль святочным феерверкам.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Віншуем!

У Белтэлерадыёкампаніі стала больш узнагарод!

Праект «Еда хоть куда» тэлеканала «НТБ-Беларусь» стаў лаўрэатам XXI Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Познай Беларусь» у намінацыі «Матэрыял года. Відэаматэрыял года». А праграма «Маршрут пабудаваны» тэлеканала «Беларусь 1» апынуўся сярод дыпламантаў гэтага конкурсу ў той жа намінацыі.

Сёлета ў трынаццаці намінацыях разглядалі 834 работы, каб вызначыць найлепшых. Маштабны конкурс «Познай Беларусь», паўдзельнічаць у якім можа любы жадаючы, праводзіцца Міністэрствам спорту і турызму сумесна з Нацыянальным агенцтвам па турызме з мэтай фарміравання іміджу Беларусі як краіны, якая мае спрыяльныя ўмовы для развіцця турызму, а таксама для заахвочвання дасягненняў у індустрыі адпачынку і вандровак.

Праект «Еда хоть куда» ў сваёй намінацыі стаў лаўрэатам сярод 95 творчых работ. Каманда праграмы ставіць перад сабой задачу скласці падрабязную гастранамічную карту нашай краіны, адшукаўшы сапраўдныя нацыянальныя кулінарныя тонкасці. А таксама жадае пазнаёміць свайго гледача з гісторыяй і традыцыямі рэгіёнаў, раёнаў ці маленькіх гарадкоў альбо паселішч. Пра тое, дзе можна карысна правесці час і пакаштаваць эксклюзіўныя стравы, падрабязна кожны раз паведамляе вядучы Уладзімір Богдан. Ён падарожнічае па Беларусі і расказвае пра нашы кулінарныя традыцыі кожную нядзелю ў эфіры тэлеканала «НТБ-Беларусь».

Алена ДРАПКО.

Фота Белтэлерадыёкампаніі.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 207

З 4 да 9 снежня ў г .Санкт-Пецярбургу (Расія) праходзілі традыцыйныя спаборніцтвы па шашках-64 «Мемарыял В. А. Сокава». Нашу краіну прадстаўлялі пяць спартсменаў.

Марыя Часнакова выйграла жаночы залік у маланкавай праграме і заняла трэцяе месца ў класічнай. Яўгенія Швед стала найлепшай сярод юніёрак да 20 гадоў у абедзвюх праграмах.

9—10 снежня ў Гомелі адбыліся адкрытыя рэспубліканскія спаборніцтвы па шашках-64 памяці Э. Р. Рыбакова.

1-2 месца падзялілі майстар спорту Марат Леў (Слонім) і міжнародны гросмайстар Яўген Кандрачэнка (Гомель) па 16 ачкоў з 18 магчымых.

Па дадатковых паказчыках на першым месцы малодшы па ўзросце і спартыўным званні.

На трэцім месцы яшчэ адзін гамяльчанін кандыдат у майстры Дзмітрый Шымакоў — 14 ачкоў.

У турніры прынялі ўдзел 40 шашыстаў.

Кампазіцыі ў шашкі-64 складзеныя вядучым рубрыкі.

№ 194



№ 194
Белыя простыя: c1, e1, d2, f2, e3, d4, f4, a7 (8)
Чорныя простыя: h2, b4, h4, d6, b8, f8, дамка: f6 (7)
№ 195
Белыя простыя: e1, d2, c3, e3, f4, e5 (6)
Чорныя простыя: a3, h4, c5, d6, f6, c7, e7, g7 (8)
№ 196
Белыя простыя: e3, f4, e5, g5, c7 (5)
Чорныя простыя: c3, h4, a5, d6, e7, g7, b8 (7)
№ 197
Белыя простыя шашкі: a1, d4, f4, e5, d6, a7, e7 (7)
Чорныя простыя шашкі: b2, f2, c3, b4, h4, a5, h8 (7)

15 снежня 60-гадовы юбілей адзначыў міжнародны майстар па шашачнай кампазіцыі Віктар Шульга. Ён з'яўляецца адным з найлепшых шашачных кампазітараў Беларусі. Віктар шматразовы чэмпіён і прызёр чэмпіянатаў Беларусі па шашачнай кампазіцыі, складае кампазіцыі ва ўсіх жанрах. Быў бронзавым прызёрам чэмпіяната свету па праблемах-100. Доўгія гады ўзначальваў камісію па шашачнай кампазіцыі пры ФМЖД (міжнароднай федэрацыі шашак). Віктар з'яўляецца вельмі моцным рашальнікам, у спісе яго дасягненняў ёсць тытул чэмпіёна свету па рашэнні шашачных кампазіцый. Сёння прапануюцца яго новыя творы на стаклетчатай дошцы.

№ 198
Белыя простыя: 38, 39, 17, 12, дамка: 6 (5)
Чорныя простыя: 37, 35, 30, 20, 10, 2, дамка: 47 (7)
№ 199
Белыя простыя: 41, 38, 39, 28, 6 (5)
Чорныя простыя: 36, 35, 30, 20, 10 (5)
№ 200
Белыя простыя: 38, 40, 21, 17, 9 (5)
Чорныя простыя: 31, 35, 30, 16, 7, 4 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 206 ад 08.12.2023

№ 188 1. c5-a3 e7:c5 2. a3:e7 f8:d6 [2...e3:c5 3. g1:e3 f8:d6 4. h6:f8]
3. h6:a3 e3:c5 4. g1:e3+
№ 189 1. a5-b6 c7:a5 2. a7-b8 f4:d6 3. b8:f8 h2:f4 4. c3:g7 a5:a1 5. g7-h8 f4-g3
[5...f4-e3 6. f8-d6 e3-d2 7. d6-e5 a1:f6 8. h8:e1] 6. f8-c5 g3-h2 7. c5-g1+
№ 190 1. g5-h6 e3:c5 2. c3-b4 c5:a3 3. a1-b2 a3:g5 4. h4:f6 e5:g7 5. h6:g1 g3-f2 6. g1:e3 h2-g1 7. e3-c5 g1:b6 8. a5:c7+
№ 191 1. 19-14 12:32 2. 14:05 30:19 3. 05:03 42-48 4. 43-38 32:43 5. 29-23 28:19 6. 03-26 43-49 7. 41-37 48:31 8. 26:10 15:04 9. 50-44 49:40 10. 35:44+
№ 192 1. 33-28 39:50 2. 17-12 50:13 3. 12:05 06:17 4. 19:08 02:13 5. 24-20 25:14 6. 05:42 41-47 7. 46-41+
№ 193 1. 46-41 37:46 2. 28-22 46:19 3. 14:23 05:14 4. 23-18 12:23 5. 33-28 23:43 6. 47:18 02-08 7. 36-31 11-17 8. 22:11 06:17 9. 31-27 17-22 10. 18-12 22:31 11. 12:03 31-37 12. 03-14 37-42 13. 14-37 42:31 14. 26:37+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У.Ваўчкоў (Маладзечна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013» e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Раім выпісаць

ЧАСТКА ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ КРАІНЫ

Газета «Літаратура і мастацтва» — штотыднёвае выданне творчай інтэлігенцыі краіны — усе 90 гадоў свайго існавання з'яўляецца той крыніцай, праз якую чытач можа пазнаёміцца з найлепшымі набыткамі краіны ў сферы культуры. Першы нумар газеты трымалі ў руках класікі беларускай літаратуры Янка Купала, Якуб Колас, якія разумелі плён асветы грамадства праз сродкі масавай інфармацыі. Назва выдання ўжо тады вызначыла яго тэматычнае напаўненне і канцэпцыю.

Штотыднёвік заўсёды адкрываў беларускаму чытачу новыя імёны ў літаратуры, праз яго адбывалася знаёмства з новымі творамі вядомых аўтараў: Кузьмы Чорнага, Петруся Броўкі, Кандрата Крапівы, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Андрэя Макаёнка, Уладзіміра Караткевіча і іншых літаратараў.

Сёння выданне працягвае адлюстроўваць літаратурны працэс у краіне. Рэдакцыя асвятляе дзейнасць Саюза пісьменнікаў Беларусі як у рэспарцёрскім, так і ў аналітычным ключы. У кожным нумары анансуюцца мерапрыемствы, запланаваныя рэгіянальнымі і Мінскай гарадской арганізацыямі СПБ. На старонках газеты са сваімі меркаваннямі пра літаратурны працэс, важныя падзеі палітычнага і грамадскага жыцця краіны рэгулярна выступаюць ганаровы старшыня творчага саюза народны пісьменнік Беларусі Мікалай Чаргінец, старшыня СПБ Алесь Карлюкевіч, першы намеснік старшыні грамадскага аб'яднання Алена Стэльмах, кіраўнікі абласных арганізацый Таццяна Дземідовіч, Тамара Краснова-Гусачэнка, Уладзімір Гаўрыловіч, Людміла Кебіч, Міхась Пазнякоў, Леанід Крыванос, Алесь Казека, многія іншыя вядомыя пісьменнікі. Адкрывае газета і новыя імёны ў літаратуры: у рубрыцы «Дэбют» чытачы могуць пазнаёміцца са спробамі пяра тых, хто робіць першыя крокі ў літаратурнай творчасці.

